Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 140 (522) Чацьвер, 15 сьнежня 1927 г. | Выходзе тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Вайна рэлігійным выдумкам і царкоўнай хлусьні.

ЗАМЕСТ ЦАРКОЎНАЙ ГНІЛОЙ „УРАЧЫСТАСЬЦІ“—БАДЗЁРАЕ КОМСАМОЛЬСКАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ.

Каб паранейшаму прыгнятаць беднату, папы і кулакі выдумваюць розныя фокусы. — Бог цярпеў, і нам вялеў—так кажуць духоўныя пастыры. — Папоўскія цуды абходзяцца сялянам вельмі дорага. —Каляда, ці 366 „калядных каўбас“ у годзе.

Над папоўскімі калядамі паставім тоўсты крыж.

Хутка ўрачыстымі гукамі званоў, папоўскімі „славесамі“, п'янкай і абжорствам дадуць аб сябе знаць старыя, рэлігійныя каляды.

Пачнуцца калядныя дні, дні „ялейнай“ папоўшчыны, рэлігійнага зацямненьня галоў, дні, якія ідуць побач з „сьвяточным“ разгулам і дэбашырствам.

Чорныя сілы царквы ўжо зараз імкнуцца „ва славу божую“ скарыстаць „вялікае сьвята“.

Папоўшчына ў такія сьвяты імкнецца палавіць рыбак у мутнай вадзіцы, імкнецца выклікаць уздым падаючай рэлігійнасьці ў шырокіх народных масах.

Папы пусьцяць у ход усе магчымасьці, якія ёсьць у іх, каб узьдзейнічаць на пачуцьці багамольных старычкоў і баб.

На гэтую папоўскую мобілізацыю мы павінны адказаць супроцьмобілізацыяй з нашага, комсамольскага боку.

Наша задача—ўвыставіць супроць папоўскіх легэнд аб калядах—навукова-абаснаваную праўду аб паходжаньні сьвята, на іх казаньні—адказаць растлумачэньнем таго, якой клясе служыла царква.

Разгорнутая супроць-рэлігійная пропаганда—вось чарговая, баявая задача нашых клюбаў, комсамольскіх ячэек, хат-чытальняў, нардаму і ўсёй грамадзкасьці ў калядныя дні.

Рашучым павінен быць наш націск на сэктанцкія організацыі, якія робяць упартыя спробы распаўсюдзіць свой уплыў на моладзь.

Іх спробы трэба сустракаць разбураючым выкрываньнем дзейнасьці гэтых сэкт, якія зьяўляюцца сейбітамі цемры і распусты.

Нам трэба адцягнуць моладзь ад царквы і п'янкі. Вечары самадзейнасьці, чырвоныя вячоркі, лыжныя вылазкі, колектыўныя наведваньні тэатраў і кіно, таварыскія вячоркі, з адпаведным зьместам—вось, што трэба організаваць у дні каляд комсамольскім ячэйкам.

Усю падрыхтоўку да каляд трэба рыхтаваць загадзя, праўмана, а ня толькі ў апошнюю хвіліну перад сьвятам.

Грунтоўная папярэдняя падрыхтоўка комсамольскіх ячэек дасьць магчымасьць паставіць тоўсты крыж над папоўскімі калядамі.

Давесьці хлусьню хрысьціянскага сьвята.

Дырэктыва ЦК УсеЛКСМ усім організацыям саюзу.

Не штурмаваць неба, а навуковым шляхам даводзіць хлусьню усю царкоўнай выдумкі. Зьбіраць сродкі на самалёт «Бязбожнік».— Працу праводзіць сумесна з ячэйкамі бязбожнікаў.

Цэнтральны Камітэт УсеЛКСМ, у зьвязку з набліжэньнем калядных сьвятаў, даў усім організацыям паказаньне, як праводзіць «анты-палестынскую» кампанію, растлумачваючы сутнасьць сьвята 25-га сьнежня—што пры гэтым ставіць у асяродак усяе падрыхтоўчай працы і інш.

Разгортваючы антырэлігійную агітацыйна-пропагандысцкую работу ў сувязі з сьвятам нараджэньня Хрыста, комсамольскія організацыі павінны прытрымлівацца наступнага.

Перад сьвятам, наладжаныя ў [illegible] чытальнях, [illegible] гутаркі [illegible] вох даклады, вечары, [illegible] спэцыяльных нумароў жывых газэт, [illegible] такія тэмы, як: «Рэлігійная пропаганда [illegible]», «Ці [illegible] рэлігійныя», «Чаму [illegible] СССР», «Рэвалюцыйнага [illegible]», «Рэлігія і моладзь», «Чаму перашкаджае рэлігія будаваць соцыялізм», «Рэлігія і навука аб непарочным зачацьці», «[illegible] рэлігія», «Што кажа рэлігія і навука аб непарочным зачацьці», «Як праводзіць моладзі калядны ў сям'і—ці наладжваць баль». Апрача гэтага, для вёскі могуць быць «Ці дапамагае рэлігія будаваць культурны быт», высунуты наступныя тэмы: «Сонца-бог і сонца работнік», «Каляды на службе ў кулацтва» «Што дапаможа сельскай гаспадарцы: Навука, ці рэлігія».

Як у горадзе так і ў вёсцы, з мэтай адцягненьня моладзі ад рэлігійнага сьвяткаваньня побач з непасрэднай антырэлігійнай пропагандай трэба наладжваць шырокія масавыя гуляньні, карнавалы на катках, на зімніх пляцоўках, спортыўныя і стралковыя спабарніцтвы, масавыя паляўнічыя вылазкі, паказваньне на пляцох кіно-стужак і іншыя мерапрыемствы.

Зьвярнуць увагу на ўзмацненьне дзейнасьці комсамольскіх ячэек у масцовых ячэйках саюзу бязбожнікаў, у рабоце па антырэлігійнай пропагандзе, уцягненьні новых членаў у саюз бязбожнікаў, організацыі антырэлігійных гурткоў, узмацніць справу распаўсюджаньня антырэлігійнай літаратуры, актыўна ўдзельнічаць у зборы сродкаў на самалёт «Бязбожнік».

Уся антырэлігійная праца павінна праводзіцца сумесна з саюзам бязбожнікаў. Ва ўсёй кампаніі ў горадзе трэба орыентавацца на вызначаныя дні адпачынку па новым стылю, а ў вёсцы—па старым.

ЦК УсеЛКСМ раіць наступную літаратуру: «Клуб против церкви», «Молодым безбожникам», „Антирелигиозник“ за декабрь, «Комсомольский Агитпропработник» № 23.

АБЖОРНЫЯ ДНІ.

Калі я, чалавек бязбожны і неспакушаны на «тонкасьцях» хрысьціянства, запытаўся прадстаўніка старога пакаленьня аб сутнасьці галоўнейшых царкоўных сьвят, дык атрымаў такі адказ:

— М-м-м... бачыце, малады чалавек. Нашы сьвяты—ёсьць успаміны найвялікшых эвангэльскіх здарэньняў. Вялікдзень, напрыклад.

Гэта-ж урачыстасьць! Вы разумееце: цэрквы упрыгожаны, уйма сьвету рознаколернага, твары зьяюць... Хвілі салодкіх чаканьняў... і ўсё гэта так прыгожа, урачыста... Крэстны ход, сьпевы...

— Ну а каляды? Што тут «урачыстага» і «прыгожага»?!

— Ну, а як-жа?! Каляды таксама... Мм... мм... Ёлка, напрыклад... Дзетвара радуецца. А на стале — і гусяціна, і парасяціна, і цяляціна, і чаго толькі душы заманіцца.

Многа і доўга гаварыў мне гэты інтэлігенты адукаваны чалавек мінулага.

Абжорства, яда—у асяродку ўсяго. Яда—да аб'ядзеньня, да рвоты, да хваробаў страўніка, «да адвалу».

Так праходзілі хрысьціянскія сьвяты.

Але часы мяняюцца.

Наша рэволюцыйная эпоха стварае новыя сьвяты, сьвяты разумныя, нашы.

Нядаўна мы сьвяткавалі **дзесятую гадавіну Кастрычніка**. У гэта найвялікшае сьвята пролетарыяту мы паказалі і даказалі, як наша ўрачыстасьць у сотні раз перавышае па сваёй прыгожасьці, бадзёрасьці і энтузіязму ўдзельнікаў царкоўныя, закасьцянелыя, адмёршыя «ўрачыстасьці».

Мы прымаем каляды, як **дні адпачынку. Мы здолеем адпачынак у гэтыя дні запоўніць вясёлымі гульнямі, карыснымі справамі.**

Чырвонаармеец **А. Белякоў.**

„Уладыка міру на зямлі—бог“.

Хай будуць цэлымі галовы.

Старанна рыхтуюцца папы да каляд. Ганебна і хлусьліва гавораць яны аб райскім жыцьці, аб сьвеце божым.

У той час, як папы кажуць аб міры, над нашым Савецкім Саюзам навісае пагроза вайны. Капіталістычныя з кожным днём усё з большым шалеўствам рыхтуюцца да вайны з намі, а паразіты, сэктанскія ўгоднікі гавораць аб тым, што ўсе людзі—браты, што гасподзь вучыў жыць усіх мірна, згодна.

Памазанікі божыя.

„Бог цярпеў і нам вялеў“.

Комсамольцы і моладзь таксама павінны распачаць сваю падрыхтоўку да анты-калядаў. Трэба зараз-жа ў хатах чытальнях распачаць растлумачэньне моладзі і старым, што такое каляды, адкуль яны паходзяць.

Моладзь не павінна рэзка выступаць супроць старых, зьнявагаць іх рэлігійныя погляды. Трэба растлумачваць, трэба толькі падрабязна выкрываць рэлігійны дурман, а не абвінавачваць і клясьці веруючых. Калі поп у царкве робіць прамову аб божым міры, то абавязак перадавой моладзі сабрацца ў хаце-чытальні ці ў асобнай хаце, на вуліцы і весьці гутарку на тэму—папоўская калядная пропаведзь і пагроза вайны СССР, каму прыносіць карысьць рэлігія—багачу ці бедняку і г. д.

Трэба ўсюды растлумачваць міжнароднае становішча, ваенную небясьпеку з боку міжнароднай буржуазіі.

У хатах-чытальнях трэба наладжваць гутаркі на тэму—чаму людзі варожаць, чаму наладжваюць маскарады і інш. Каб перацягнуць цікавую моладзь, трэба змагацца з забобонамі. Трэба пры дапамозе настаўніка [illegible] гутаркі аб тым, куды [illegible] пасьля сьмерці (аб [illegible] жыцьці [illegible]) [illegible].

Навуковымі гутаркамі і дакладамі трэба разьбіваць [illegible], звычай і старыя прывычкі.

Для п'янога—няма бога.

Наступіць дзень сьвята і пачнуцца па вёсках п'янкі і разгулы. Будуць біцца, прабіваць галовы. А што-ж павінны рабіць маладыя перадавыя сяляне?

Каб адцягнуць моладзь ад старых звычаяў, трэба організаваць новае веселье. Да сьвята трэба каб у хаце-чытальні закіпела ўсю працу, у ёй трэба наладжваць вечары, гутаркі з пытаньнямі і адказамі на тэму сонца—бог і сонца—работнік, рэлігія і моладзь. Там, дзе ёсьць настаўнік, трэба прыцягнуць яго да навукова-тэхнічнай гутаркі, каб ён паказаў навучныя фокусы, выкрыцьцё цудаў.

Наладжвайце голаснае чытаньне.

Вялікі інтарэс і карысьць прынясе голаснае чытаньне цікавых кніжак з папоўскага жыцьця, пра рэлігію. Матар'ял для голаснага чытаньня можна знайсьці ў зборніку апавяданьняў Тарасы Гушчы „У ціхай вадзе“, у зборніку З. Паваротнага „Комсамольскія вячоркі“, у зборнічках Дзеркача „Пра папоў“, Крапівы „Біблія“ і інш.

Уся растлумачальная работа павінна праходзіць галоўным чынам да сьвята. У дні-ж каляд трэба весяліцца і адпачываць, але толькі весяліцца папоноўму. Ня трэба забывацца, што моладзь любіць гуляць, весяліцца, радавацца. Замест папоек, наладжваньняў „бараў“, моладзь павінна наладзіць масавае вясельле, гуляньне, з гармонікам, скрыпкай, з прыпеўкамі, з дэкламацыяй.

Трэба організаваць зборы сродкаў на вечарох і гульнях на самалёт „Бязбожнік“.

Супроць багоў, супроць папоў-абманшчыкаў, супроць п'яных разгулаў на вёсцы,— павінна паўстаць наша моладзь і процістаўляць усяму гэтаму бруду разумнае і весёлае скарыстаньне вольнага часу!

У тэатр і кіно.

(Ляхаўскі раён, Менск).

Комсамольскія ячэйкі Ляхаўкі распачалі шырокую падрыхтоўчую працу да правядзеньня каляд.

Гэтымі днямі райком рассылае па ўсіх ячэйках тэзісы для антырэлігійных гутарак, якія будуць праводзіцца з рабочай моладзьдзю ў часе абедзенных перапынкаў на прадпрыемствах.

Комсамольская ячэйка пры Наркамюсьце наладжвае 25-га сьнежня разам з юнсэкцыяй клюбу Саўгандальслужачых вялікі антырэлігійны вечар для моладзі.

Гэткі-ж вечар падрыхтоўваецца у клюбе Леніна комсамольскім колектывам Заходніх чыгунак.

Комсамольская група канартдзівізіі падрыхтоўвае антырэлігійныя вечары для чырвонаармейцаў па асобных батарэях. У чырвонаармейскіх вечарох прыме ўдзел таварыская комсамольская ячэйка другога скуранога заводу.

Для падрыхтоўкі вечару чырвонаармейцы выкарыстоўваюць газэту і часопісь „Бязбожнік“.

Ячэйка БДУ наладжвае 24-га сьнежня дыспут на бытавыя тэмы.

Вечар антырэлігійнай пропаганды падрыхтоўвае і ячэйка Цэнтральнага Інстытуту Працы.

Акрамя гэтага, у дні каляд ячэйкі наладзяць масавыя катаньні моладзі на лыжах і каньках, колектыўныя наведваньні кіно і тэатраў.

ЛЯХАЎСКІ.

Пра „калядныя каўбасы“ і іншыя выдумкі.

У адным з папярэдніх нумароў нашай газэты мы давалі, кім і для чые карысьці выдуманы багі і ўся рэлігія, хто і для чаго зацікаўлены ў падтрыманьні веравання ва «ўсявышняга» сярод працоўных, ці нараджаўся Ісус Хрыстос, чаму хрысьціяне сьвяткуюць дзень 25-га сьнежня, як дзень «нараджэньня сына божага», чаму комуністыя і комсамольцы ня вераць у бога і г. д.

Да каляд, больш як да іншых царкоўных сьвятаў, прыстасоўвацца шмат розных забабонаў чыста бытавога парадку, напрыклад: варажба, спэцыяльныя стравы ежы, елка, цатаньне гарэхамі, гарбузікамі і інш. Адкуль паходзяць гэтыя ўвайшоўшыя ў быт селяніна забабоны, хто іх выдумаў—ня можа нас ня цікавіць.

„Елка з пуцяводнай зоркай“.

Мабыць веруючыя людзі разачаруюцца, калі даведаюцца, што як найпрыгажэй убраная імі калядная ёлка ня толькі ня мае нічога агульнага з успамінамі аб нараджэньні Ісуса Хрыста, але зьяўляецца чыста старадаўнім паганскім звычаем, аб зьнішчэньні якога доўгі час клапацілася сама царква.

Елка, як вядома, не расьце ў Палестыне і ўжо з адпае гэтай прычыны ня можа быць нічым зьвязана з легендарным жыцьцём Хрыста.

У старажытных плямёнаў, якія жылі невялікімі сем'ямі ў Паўночнай і Сярэдняй Эўропе—існаваў пастаянны звычай: зьбірацца на гаспадарчыя сходкі ці на сьвяточныя карагоды, сьпевы і скокі—навокал укапанай у зямлю маладзенькай елачкі, ці проста яловага абчэсанага слупа. Такія самыя слупы яшчэ і зараз укопваюць у зямлю сяляне такіх краін, як Маравія і Далмацыя, у час вясельных песень і гульняў.

У самае-ж галоўнае сьвята,—у «сьвята сьвятаў»—у «нараджэньне сонца» гэты самы слупавы звычай праводзіўся з асаблівай прыгожасьцю і «ўрачыстасьцю».

Навейшыя плямёны запазычылі «елачныя» паганскі звычай ад старых часоў, які, з лёгкай рукі, дайшоў і да нас.

„Срэбраны дождж“, зьвязда“, гарэхі, цукеркі.

Сьсякалася выбраная прыгожая і галінастая маладая елачка, яе вяршынка ўпрыгожвалася ў гонар сонца драўляным кружочкам з накалёванымі, або выразанымі праменьнямі.

Паганскае племя **гольдаў**, якое жыве на тэрыторыі Усходняга Сібіру, яшчэ і зараз ушаноўвае сваю **сьнежаньскую** елку **зьвяздой**. Нічога агульнага з «асьвятляўшай шлях валхвом» зьвяздой гэты звычай, як бачым, ня мае. Гэты паганскі сэнс царква доўга замяніла рознакалёрнай зьвяздой і замазала «пышнасьцю» шанаваньне сонечнага сьвята старажытнымі плямёнамі.

Ад зьвязды на макушцы да ніжніх галінак елкі першабытныя людзі насноўвалі **акрайцы разхварбованай скуры.**

— «Што гэта таксе?»—цікавіліся вандроўнікі ў дзікароў Ціхаакіянскіх высцаў, бачучы дакладна такое-ж упрыгожаньне іх «грамадзкіх слупоў».—«Гэта дождж»—адказвалі яны.

Аб даждзы ў будучае лета малітвамі прасілі земляробы добрых духаў і развешвалі сымболь гэтага дажджа, абрэзкі скуры, на галінках елкі.

Вядома, тыя гаспадыні, якія купляюць на «сьвяты дзень» срэбраную сапожку для ёлачнага «дажджу», аб гэтым не дагадваюцца. **Растлумачыць ім сэнс гэтых калядных прыкрас—наш абавязак.**

„Калядная каўбаса“.

Ужо з канца восені пазбаўленая корму жывёла прырэзвалася дзікаром-земляробам і зьядалася пахудаўшымі людзьмі. К канцу сьнежня з скаціны заставаліся галоўным чынам, адны сьвіньні, якія карміліся адбросамі яды чалавека, дзякуючы чаму маглі працягнуць сваё існаваньне.

У сьнежні адбыўся масавы і апошні ўбой сьвіньняў, прызначаных для мяса.

Жывёлаводы-бураты сьвяткуюць і ў нашыя дні кожны год, прыблізна у сярэдзіне сьнежня, дзень **«багатага ўбою»**.

А хіба ў нас на Беларусі селянін ня посьціць цэлую «піліпаўку», скарачаючы ўжываньне хлеба сям'ёю, стараючыся адкарміць падсьвінака для „калядная каўбасы“.

Гэта, з аднаго боку, і ня дрэнна, што селянін клапоціцца аб сваім заўтрашнім дні, але дрэнна тое, што ён і да **гэтай простай неабходнай жыцьцёвай патрэбы падыходзіць з „папоўскай меркай разуменьня**, глядзіць на жаданьне палепшыць сваю яду праз царкоўныя акуляры.

Савецкая ўлада імкнецца, каб селянін меў **366 «калядных» каўбас у годзе**, каб з яго стала ня зьнікала мяса з масланым ні ў піліпаўку, ні ў вялікі пост. Такі час не за гарамі.

15-ты зьезд УсеКП(б).

5-цігадовы плян гаспадарчага будаўніцтва СССР

Садаклад тав. Кржыжаноўскага.*)

Пройдзены этап будаўніцтва.

Зараз, калі мы стаімо ля парогу новага этапу разьвіцьця нашае гаспадаркі, які будзе характэрным рэконструкцыйнымі работамі, сказаў дакладчык,—некаторыя нашыя экономістыя ня вераць у гэтую работу. Гэтае недавер'е да творчых сіл рабочае клясы ня мае ніякіх падстаў, бо ад самага пачатку аднаўленчага пэрыоду мы ня толькі імкнуліся аднавіць зруйнаваную гаспадарку, але ажыцьцёвілі, апрача таго, яе рэконструкцыю. Зрабіўшы сродкі вытворчасьці грамадзкімі, мы нашай прамысловасьці далі зусім іншую аснову ў параўнаньні з прамысловасьцю любога капіталістычнага краю. Такое рэконструкцыйнае працы сьвет яшчэ ня ведаў.

Пра нашыя посьпехі за гэты пэрыод часу гаворым ня толькі мы — удзельнікі гаспадарчага будаўніцтва. Пра іх гавораць таксама асобы, ня маючыя ніякага дачыненьня да нашае працы. Так, амэрыканская дэлегацыя, якая наведалася летась Савецкі Саюз, у сваёй справаздачы прымушана прызнаць нашыя гаспадарчыя посьпехі.

Генэральны плян будаўніцтва народнае гаспадаркі, складзены ў 1920 г., які Ленін назваў пляном вялікіх прац, мы выконвалі здавальняюча. За гэты пэрыод часу мы дасягнулі яшчэ аднаго вялічэзнага посьпеху—прыцягнулі да соцыялістычнага будаўніцтва вялікую армію інжэнэрна-тэхнічных сіл, якія ўпачатку аднаўленчага пэрыоду лічылі немагчымымі якія-небудзь посьпехі ў справе гаспадарчага будаўніцтва і ўскладалі ўсю адказнасьць за гэтую справу на рабочую клясу, якая ўзяла ўладу ў свае рукі.

Далейшыя задачы.

У справе далейшага разьвіцьця народнае гаспадаркі мы маем тры агульныя задачы. Першая ў тым, што **мы робім стаўку на такі тэмп будаўніцтва, якога ня ведае капіталістычны сьвет.** Другая задача, гэта **патрэба ўвязаць вытворчыя процэсы з процэсамі разьмеркавяўчымі.** І трэцяя—**умацніць абароназдольнасьць СССР.**

Пры вырашэньні гэтых задач будуць, зразумела, зьяўляцца вялікія цяжкасьці, пераможаць якія здолее партыя і рабочая кляса толькі ў тым выпадку, калі яны згрупуюць на вырашэньні гэтых задач усе свае сілы, усю сваю волю. Партыя нясе адказнасьць за выкананьне гэтых задач ня толькі перад працоўнымі Савецкага Саюзу, але і перад усім сьветам, бо пролетары ўсяго сьвету пільна прыглядаюцца да нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Бальшавікі не здрыгануліся, калі бралі ўладу, яны не здрыгануцца і зараз, калі перад намі паўсталі вялічэзныя задачы гаспадарчага будаўніцтва.

Наш пяцігадовы гаспадарчы плян.

У 1924-25 годзе ўпяршыню зьявіліся кантрольныя лічбы разьвіцьця народнае гаспадаркі. Праўда, гэта былі далёка ня ўзорныя кантрольныя лічбы, але яны далі магчымасьць скласьці ў наступным 1925-26 годзе больш дакладныя кантрольныя лічбы, а ў 1926-27 г. мы маем кантрольныя лічбы, якія даюць падставу і магчымасьць будаваць гаспадарчыя пляны для асобных галін прамысловасьці.

* * *

Дзяржаўная плянавая камісія ўпэўнена, што на падыходзячым зьезьдзе саветаў яна ўжо здолее выступіць з канчаткова распрацаваным пяцігадовым пэрспэктыўным плянам разьвіцьця народнае гаспадаркі СССР.

Цяжкасьць складаньня пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі, апрача усіх іншых прычын, залежыць таксама і ад таго, што па некаторых галінах даводзіцца лічыцца з пэрспэктываю, якая выходзіць далёка за межы 5-цігадовага пэрыоду.

Як трэба адносіцца да лічбаў, якія будуць у пяцігадовым пляне? Было-б вялікаю памылкаю глядзець на гэтыя лічбы, як на нешта абсалютнае, не падлягаючае ніякім зьменам. Наадварот, штогодныя кантрольныя лічбы народнае гаспадаркі будуць рабіць у гэтым пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі належныя зьмены і ўдакладненьні. Такім парадкам мы можам ухіліцца ад бюрократызацыі пляну, якую Ленін лічыў адною з галоўных небясьпек у плянавай працы.

Галоўны вывад з урокаў аднаўленчага пэрыоду той, што новая экономічная політыка надзвычайна сабе апраўдала. Якія нашы задачы ў галіне вытворчасьці? З 1925 году мы распачалі займацца пытаньнямі стандартызацыі. Вопыты ў галіне стандартнае цэглы [illegible] металу паказваюць, што мы можам паставіць гэтую справу ў 3 з паловам разы ў параўнаньні з сучасным. Першыя крокі стандартызацыі ў звойкавай прамысловасьці абяцаюць нам экономію больш як 250 тысяч рублёў у год. Стандартызацыя ў галіне тытунёвае вытворчасьці дае экономіі ад 4-х да 5-ці мільёнаў рублёў і г. д.

Плянавае зьбіраньне нашае прамысловасьці яшчэ не пастаўлена на належную вышыню.

Спыняючыся на пытаньні аб суадносінах у нашай гаспадарцы між цяжкаю і лёгкаю прамысловасьцю, дакладчык зазначае, што да гэтае справы мы павінны мець вельмі асьцярожны падыход.

Закранаючы пытаньні сельскае гаспадаркі, тав. Кржыжаноўскі адзначае выключнае значэньне нядаўняе дырэктывы ЦК аб землеўпарадкаваньні і землекарыстаньні. Ён падае факты, што ўжо ў сучасны момант мы, шляхам трактарызацыі, без амэрыканскіх шляхоў і амэрыканскіх тэлефонаў дамагліся ў справе савецкае гаспадаркі на Украіне буйных посьпехаў. Савецкія гаспадаркі становяцца апорнымі пунктамі ў справе ўкараненьня рэволюцыйных пачаткаў у сялянскія гаспадаркі. Трактарызацыю сялянства спатыкае з спачуваньнем, прычым гэтаму руху выключна надаюцца грамадзкія формы. Таму адгэтуль і незадаволеньне кулацтва трактарнай кампаніяй. У сяле Сычоўка быў нават бунт кулакоў проці трактараў.

Тав. Кржыжаноўскі спыняецца ў далейшым на пытаньні аб капітальным будаўніцтве і выкрывае прычыны вялікае лічбы нашага будаўнічага індэксу. Асноўная прычына—гэта адсталы дзедаўскі напалову саматужніцкі мэтад вырабу будаўнічых матар'ялаў. Нам трэба цяпер, чаго-б гэта ні каштавала, рацыяналізаваць выраб будаўнічых матар'ялаў.

Плян—гаворыць т. Кржыжаноўскі,—зьяўляецца рашаючым у нашай дзейнасьці па рэконструкцыі гаспадаркі. Таму мы павінны на гэтым зьезьдзе высунуць лёзунг: «давай плян».

Якое становішча з ленінскім пляном электрыфікацыі? Да 1931 г. генэральны плян электрыфікацыі ня толькі будзе скончаны, але нават будзе трохі перавышан. У выніку рэалізацыі ленінскага пляну электрыфікацыі па СССР будзе засяляваны шэраг магутных электрыфікаваных раёнаў з велізарнымі радыусамі. Каля 70 мільёнаў сялянскага жыхарства, ахопленага коламі электраперадачы, атрымае магчымасьць карыстацца электрычнасьцю, прыкладна ў колькасьці 4-5 конскія сіл на кожнага селяніна.

Наша творчая энэргія знаходзіцца зараз—закончыў свой даклад Кржыжаноўскі—у вышэйшым вольтажы. Мы ведаем, што нас чакае ня мала цяжкасьцяў наперадзе, але мы іх пераможам, бо мы [illegible]

*) Асноўны даклад аб пяцігадовым пляне гаспадарчага будаўніцтва зроблен т. Рыкавым. Даклад т. Рыкава будзе дадзены ў адным з чарговых нумароў.

Да гадавіны Комсамолу.

Нашы дасягненьні.

(Слабадзкая ячэйка комсамолу, Любаньскі раён).

Увага ўсёй працы ячэйкі значнае месца займала гаспадарчая праца, якая выражалася ня толькі ў правядзеньні растлумачэньня тых ці іншых карысных мерапрыемстваў, але і практычна праводзілася комсамольцамі ў жыцьцё.

Усе пытаньні гаспадарчага характару праходзілі спачатку праз бюро, потым праз агульны сход, дзе даваліся практычныя дырэктывы па магчымай працы ў гаспадарках асобных комсамольцаў, а таксама шырока абгаварваліся і вышукваліся формы і мэтады колектыўнай працы.

засеяць поле. Ачысьціла 100 пудоў насеньня райселькому, якое было раздана беднаце.

Па пытаньню паляпшэньня форм апрацоўкі зямлі была заслухана лекцыя аграномам на агульным сходзе ячэйкі, дзе прысутнічала шмат сялянства. Таксама вялася праца растлумачальная, у выніку чаго маем зьмяненьне барон, раньняе ворыва, паляпшэньне пласту зямлі. Што датычыцца трохполья, то каля 15 процантаў сялян на сваіх палёх сеюць канюшыну, а таксама прымяняюць раньнюю сяўбу азімых.

Свае дасягненьні ячэйка дэманстравала на сельска-гаспадарчай выстаўцы, дзе атрымала „ганаровы дыплём" і прэмію другога разраду.

Група віленскіх комсамольцаў—баявікоў, якая выконвала падпольную працу.

Сувязь з аграномамі самая добрая. Адзін аграном зьяўляецца сябрам ячэйкі і непасрэдна ўдзельнічае ў ва ўсёй ячэйкавай работе. Аграном з гаспадаркамі комсамольцаў дасканала знаёмы і даваў ім паказаньні, якія агранамічныя мерапрыемствы патрэбна ўводзіць у іх гаспадарках.

У выніку маем, што тры комсамольцы ў гэтым годзе частку сваіх палёў засеялі канюшынай і ў агародах—кармовыя буракі.

Існуе малочная арцель, у працы якой ячэйка прымае ўдзел, асабліва ў справе ўцягненьня ў арцель беднаты.

У галіне дапамогі беднаце ячэйка працавала як у справе дапамогі партячэйцы па выяўленьні сховаў беднаты шляхам разносу на дом запрашальных картак, а таксама аказвала колектыўна-працоўную дапамогу: селяніну бедняку ячэйка скасіла дзьве дзесяціны сенажаці, зграбла і злажыла ў стог.

Аднэй удаве сжала (?) жыта і дапамагла

У пэрыод вясеньняй і асеньняй пасяўной кампаніі, таксама пасьля дакладу агронома, комсамольцы ачысьцілі насеньне і ў гутарках даказвалі карысьць сартаваньня, у выніку чаго насельніцтва на 90 проц. ачысьціла насеньне. На гуртку дамаўляюцца (?) распрацавана гутарка гародніцтва.

Знаючы значэньне коопэрацыі, ячэйка поўнасьцю кооперавана у спажывецкім таварыстве і на 35 процантаў у сельска-гаспадарчым.

Падыходзячы к зімняму тэрміну, ячэйка перамяніла некалькі і напрамак працы. Быў заслуханы даклад агранома аб задачах сельска-гаспадарчага гуртка, які арганізаваны ў ім і будзе весьціся тэорэтычная падрыхтоўка комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў галіне сельскай гаспадаркі.

Смаляр.

Успамінаем мінулыя гады.

(Менск, гута Пролетары).

1923 год. Стары завод, кінуты гаспадаром [illegible] прапаваў свае існаваньне.

Дзесятак два рабочых хадзілі на заводу і стараліся наіправаць [illegible] завод. Пусьцілі яго ў ход.—Сярод іх комсамольцы. Яны бегалі па ўсім заводзе—зьбіралі раскіданыя інстру[illegible]

Першая [illegible] усмалоць першую „змену". [illegible] і глуха буляе, а завод пачаў [illegible] чакаюць рабочыя.

Гатова. Заблішчалі прамянявымі трубкі з набраным шклом.

Рос завод. Моладзь зараз на заводзе карыстаецца пашанаю ва ўсіх дарослых рабочых.

Дзякуючы комсамольцам, на заводзе палепшаны ўмовы працы, спосабы ўпакоўкі шкла, сыстэма выдачы зарплаты і г. д.

Комсамольцы актыўна ўдзельнічаюць у вытворчай камісіі, уносяць дзельныя прапановы, з якіх многія былі адобраны старэйшымі рабочымі (аб формах, аб пераводзе шкла і г. д.).

Наша ячэйка расьце. З трох чалавек [illegible] разраслася да 70 чалавек. [illegible]

Ячэйка налічвае 45 чалавек [illegible] у партшколе, 20 чалавек у політшколе і [illegible] гуртках.

Комсамольцы самі стараюцца [illegible] кваліфікацыю і мы зараз маем 8 чалавек комсамольцаў, якія працуюць майстрамі і памочнікамі. Сярод іх восем і дзяўчаты.

Сабраліся ў дзень гадавіны комсамольцы ў клюбе і ўспомнілі, як у першыя дні праца заблішчалі трубкі з набраным шклом.

Эд. Шюрын.

Комсамол у падпольлі.

Калі палякі займалі які-небудзь горад або мястэчка, то адразу-ж пачыналіся арышты.

Белым трэба было задушыць рэволюцыю. У лужынах крыві стараліся патапіць яны пролетарскую рэволюцыю.

Але гэтым самым узмацнялі рэволюцыйны настрой. Становішча рабочых станавілася жудасным. Беспрацоўе, адсутнасьць профсаюзнай абароны, аховы працы,—вось што прынесла за сабою польская армія.

Аднак ня было ніводнага гораду, ніводнага колькі-небудзь вялікага мястэчка, дзе-б ў пэрыод польскай окупацыі не вялася комсамольцамі падпольная праца.

Асабліва шырока разьвінулася падпольная праца ў Менску.

Першы фармальны сход адбыўся ў памяшканьні профсаюзу «Іголка». «Пеця» (рап-ф ён быў тав. Вараб'ёвым—членам ЦК КСМ Л і Б) зрабіў даклад аб бягучым моманце. Выбралі падпольны камітэт. Пасьля гэтага сходы адбываліся зноў у памяшканьні профсаюзаў.

«Біржа» засталася для асобных сустрэч. Калі трэба было што-небудзь паведаміць комсамольцу, перадаць даручэньне камітэту, тады прыходзілі на «біржу», шпацыравалі па алеі вясёлым гуртком, садзіліся на лаўках і тое, што трэба было, перадавалі.

Першай працай па даручэньні партыйнага камітэту, якую пачаў выконваць комсамол,—была «сувязь». Да кожнага адказнага партыйнага працаўніка—члена камітэту, прымацоўваліся па тры-чатыры комсамольцы, якія абавязаны былі неадступна хадзіць блізка каля даручанага ім для аховы комуністага і пільна сачыць, ці не наглядае які-небудзь шпіён.

Даручалі «сувязі», таксама сачыць за арыштаваным таварышом, для таго, каб даведацца, куды яго павядуць.

У аддзяленьні дэфэнзывы, на Захараўскай 45, арыштаваных вадзілі «да ветру» на двор праз вуліцу з парадных дзьвярэй. Гэтым карысталіся «сувязістыя» для таго, каб бачыць арыштаваных комуністых. Апошнія таксама стараліся часьцей «хадзіць да ветру» з тэй самай мэтаю.

На працы па сувязі комсамольцы прывучаліся да конспірацыі, набывалі першыя навыкі падпольнай працы.

Да выніку дыскусіі ў комсамоле.

Тры моманты.

ХV партыйны зьезд зьяўляецца тэй мяжою, якая фракцыйна-раскольніцкую працу опозіцыі, барацьбу партыі з ёю пакідае ў мінулым жыцьця партыі. Траты ўсіх сіл энэргіі і творчых здольнасьцяй партыі на справу соцыялістычнага будаўніцтва, ня меншай траты сіл і энэргіі на барацьбу з троцкісцкай опозіцыяй у будучым,—такая асноўная думка прамовы тав. Рыкава, сказанай ім на адчыненьні зьезду.

Гэтае палажэньне можа быць аднесена і да комсамолу, у прыватнасьці Менскай організацыі, якой за апошні час прышлося, у шкоду практычнай дзелавой працы, заняцца опозіцыяй, барацьбой з яе прыхільнікамі, праўда, нязначнымі па колькасьці, але ўсё-ж такі патрабуючымі нашай увагі і сілы.

Агульныя вынікі барацьбы з опозіцыяй у часе падрыхтоўкі да XV зьезду былі асьветлены ў папярэднім артыкуле—«Комсамол за ленінізм», таму зараз мы спынімся на неасьвятленых пытаньнях і практычных выніках для організацыі.

Твар опозіцыянэраў.

Прадстаўнікамі опозіцыйнага пункту погляду, насіцелямі троцкісцкіх ідэй і дзеяньняў (фракцыйна-раскольніцкіх) у нашай організацыі зьявіліся пераважна выхадцы з дробна-буржуазнага асяродку (сын гандляра, настаўніка, урача і г. д.), якія знаходзяцца бяз году тыдзень у вытворчасьці (1-2 гады), маладыя комсамольцы з 1925-26 г., ня рэдка кандыдаты, (Латкіны, Кастровы, Нахамкіны, Флееры) прышоўшыя ў наш саюз з зусім чужой псыхолёгіяй, фарміраваўшайся ў нерабочым асяродку і лёгка паддаліся дробна-буржуазным ідэям троцкізму, пачалі апранацца (як наогул і увесь троцкізм) у вопратку «абаронцаў» ленінізму, чысьціні прынцыпаў бальшавізму нашай партыі.

У большасьці гэтыя людзі, прышоўшыя ў саюз у 1925-26 г., зараз-жа станавіліся ў опозіцыю. Для нашай організацыі паўстае законнае пытаньне:

ці дастаткова мы правяраем таго, каго прымаем,

як дзьверы саюзу аказаліся адчыненымі для сына гандляра і таму падобных элемэнтаў.

Вынік ясны: заставаліся дзьверы адкрытымі насьцеж (з індывідуальным падыходам), (дзеля рабочай моладзі (аб якой мы ў гэтым артыкуле наогул не гаворым), яны павінны быць крыху адчынены для дасканалага адбору лепшых элемэнтаў іншай (служачай, вучнёўскай) моладзі і шчыльна зачынены для чужой дробна-буржуазнай моладзі.

Аб устрымаўшыхся.

Пры абгаварэньні тэзісаў, мы мелі некаторую частку ўстрымаўшыхся (3,4 проценты па пяцігодцы) і зусім не галасаваўшых (2,7 проц. па пяцігодцы). Асноўная маса ўстрымаўшыхся—гэта профшкольцы (складаюць амаль палову ўстрымаўшыхся), а ў складзе савецкіх ячэек зусім не галасаваўшых 8,1 проц. усіх прысутных на сходах савецкіх ячэек. Бязумоўна, што ў ліку ўстрымаўшыхся і не галасаваўшых маюцца дзьве часткі: адна—несьвядомая, ня вызначыўшая свае погляды і другая—якая не рашаецца па тых ці іншых прычынах самавызначыць сабе, ня гледзячы на разуменьне пытаньня.

Наша задача зьяўляецца ў тым, каб устрымаўшыхся і не галасаваўшых ахапіць глыбокай выхаваўчай працай, у прыватнасьці па вывучэньні рашэньняў 15-га партзьезду. Прывесьці на позіцыю партыі і саюзу, зрабіць комсамольцамі ідэйна стаячымі на пункце погляду партыі.

Перад тою-ж часткаю, якая сьвядома хавае свае сапраўдныя опозіцыйныя погляды ўстрыманьнем і не галасаваньнем,

трэба паставіць пытаньне рубам:

ці за опозіцыю і яе троцкісцкія погляды, якія ня могуць быць злучаны з прабываньнем у ленінскім саюзе і тады за дзьверы саюзу, альбо за партыю, за комсамол, сьцягам якіх зьяўляецца ленінізм, і тады праца ў гэтым саюзе, дапамога партыі ў соцыялістычным будаўніцтве. Альбо адно, альбо другое—так стаіць пытаньне.

Палепшым працу!

Пры абгаварэньні тэзісаў некаторымі таварышамі ў мэтах доказаў праваты опозіцыі і няправаты партыі прыводзіліся факты недахопаў у тым ці іншым прадпрыемстве, залежачых ад працы самых ячэек мясцовых організацый. Бачачы тыя ці іншыя недахопы мясцовага жыцьця, некаторыя таварышы сумняваліся ў праваце агульнай лініі партыі, што, вядома, у корані няверна.

Задача ўсёй нашай організацыі ад вышэйшых органаў да ніжэйшых—ячэйкі, яе камісій,—крапатлівай працы па праводзеньні лініі партыі, яе дырэктыў палепшыць працу, зьвяртаць увагу як у большым, так і самым дробным факце штодзеннага жыцьця рабочай моладзі, комсамольцаў, зьнішчаць недахопы, шэрахаватасьці ў экономічнай працы, служачыя часам для некаторых перашкод у разуменьні правільнасьці агульнай лініі партыі і саюзу.

Такавы тры моманты, на якія, нам здаецца, трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу.

А. Красоўскі.

Наступны нумар газэты „Чырвоная Зьмена" па тэхнічных прычынах выйдзе у аўторак 20 га сьнежня.

На варце інтарэсаў бядняцкай моладзі.

Комсамольскія ячэйкі дапамагаюць сваім сябрам па-культурнаму паляпшаць сельскую гаспадарку.

Комсамол вывеў мяне ў людзі.

(Чырвоны бераг. Жлобінскі раён).

У 1925 годзе я паступіў у Комсамол. Праз тры месяцы памёр мой бацька і я застаўся... гаспадаром. Гаспадарка зусім малая, абядпелая, сям'я вялікая—шэсьць душ. Мне было толькі 16 год.

Шмат хто казаў, што прапаў я, прапала наша і гаспадарка.

Але вышла зусім наадварот. **Першыя гады ва ўсёй маёй працы дапамагала мне комсамольская ячэйка. Напрыклад, не хапае ў мяне сілы скасіць луг—комсамольцы падскочаць і памогуць. Таксама і сеяць ня мог, дык старэйшыя хлопцы з ячэйкі дапамагалі і вучылі.**

Гаспадарка наша нават пачала расьці. Чытаючы розныя кнігі, слухаючы гутаркі агранома, я навучыўся гаспадарыць па-культурнаму.

Цяпер я сею карняплоды, канюшыну, віку. На зіму ўцяпліў хлявы. З мяне бяруць прыклад нават і тыя гаспадары, якія раней думалі, што я прапаў.

Вось чаму я дзякую сваёй комсамольскай ячэйцы і люблю ўвесь комсамол.

Маразевіч І.



„Комсамольскую малатарню“ для таварыства.

Задубская ячэйка ЛКСМБ, Кармянскага раёну, Магілеўская акруга.

У суботніку, які праводзіла ячэйка, прыняло ўдзел 28 чалавек беспартыйнай моладзі. Перанесьлі пусты грамадзкі магазын і на працягу 3-х дзён **збудавалі будынак для кооператыву.**

Правялі сход сельска-гаспадарчай арцелі, якой перадалі „комсамольскую малатарню“, атрыманую на конкурсе, і ўтварылі машыннае таварыства. К сьвяту была выпушчана насьценная газэта, прысьвечаная Кастрычніку. Організавалі найсковы куток. Правялі дзень сялянскай моладзі.

5-га лістапада вечарам, у клюбе адбылося ўрачыстае пасяджэньне. На другі дзень правялі дэмонстрацыю і мітынг у вёсцы **Задуб'і**, дзе прысутнічала каля паўтысячы чалавек.

Пасьля мітынгу ў клюбе—скокі для моладзі, а ўвечары бясплатны спэктакль для старых. У панядзелак правялі дзіцячы ранішнік.

Купрэеў Кузьма.



У комсамольца Макара.

Комсамолец, наш Макар,
Ля жывёлы—гаспадар.
Хлеў дагледзеў ён к зіме—
Вецер сьнегу не надзьме.

Стаў жывёлу дагляддаць,
Аграномы як казаць;
Гаспадарцы ёсьць даход
Ад жывёлы кожны год.

Невялікі хоць канёк,
Але гладкі, як мянёк,—
Канюшыну есьць, авёс
Эх, бягун зато, нябось!

А карова—нібы леў
Разраслася на ўвесь хлеў,
Есьць макуху, карняплод,
Таму доіцца ўвесь год.

Зах. Бульбянік.

Выхаваньне бядняцкай моладзі.

(Чачэвіцкі раён, Магілёўшчына).

У глухім кутку Чачэвіцкага раёну, у вёсцы **Падсельлі** у 1924 г. організавалася комсамольская ячэйка. За тры гады свайго існаваньня яна значна ўзмацнілася як з організацыйнага боку, так і з выхаваўчага. У сучасны момант у ячэйку уцягнута найбольш актыўная бядняцка-батрацкая моладзь Падсельскага сельсавету. У ячэйцы 17 чалавек. З іх толькі 2 серадніякі. Усе іншыя—бядняки і батракі.

Комсамольцы прымаюць актыўны ўдзел у гаспадарчай працы. Усе комсамольцы—зьяўляюцца членамі ячэйкі МОПР'у і ТСА Авіяхіму. Ячэйка поўнасьцю кооперавана.

На зімні час ячэйка ставіць перад сабою задачу—**поўнасьцю ўцягнуць у выхаваўчыя гурткі пры ячэйцы батрацкую і бядняцкую моладзь.**

Я. М. Савіцкі

Умейце весела праводзіць час.



Організоўвайце струнныя гурткі.

Запоўнім „бронь!“

Бронь зьнізілася на 2,1 проц.

Шсо далі апошнія 6 месяцаў.

На 1-е кастрычніка 1926 году па дзяржаўнай прамысловасьці БССР бронь складала 6,9 проц. агульнага ліку рабочых, у сьнежні 1926 году—7,6 проц. У красавіку 1927 году—7,1 проц. А ў жнiўні гэтага году **бронь па прамысловасьці ВСНГ Беларусі зьнізілася да 5,5 проц. агульнага ліку рабочых.**

Такім чынам, мы бачым, што за якіх небудзь 9 месяцаў бронь у нашай прамысловасьці зьнізілася на 2,1 проц.

Чым гэта тлумачыцца

Гэтае зьявішча тлумачыцца тым, што некаторыя гаспадарчыя органы ў апошні час спынілі набор новых падросткаў у прамысловасьць. Частка перарасткаў была разбраніравана, але аслабанiўшыяся ад іх месцы ў броні амаль што ўсе не запоўнены.

Яшчэ і да гэтага часу шмат падросткаў, якія перарасьлі ўзростам, ня выведзены з складу броні.

Пры стварыўшыхся ўмовах ёсьць пагроза далейшага зьніжэньня процанту броні ў нашай прамысловасьці.

Вось прыклады.

На дрэваапрацоўчай прамысловасьці БССР, без Гомельшчыны, на 1-е красавіка г. г. налічвалася 138 чалавек броньпадросткаў, альбо 5,7 проц. да агульнага ліку рабочых, занятых у гэтай прамысловасьці. На 1-е жніўня, разам з Гомельшчынай бронь у дрэваапрацоўчай прамысловасьці складала ўжо толькі 3,5 проц.

Гэта значыць, што, не бяручы пад увагу Гомельшчыны, за 4 толькі месяцы бронь у дрэваапрацоўчай прамысловасьці Беларусі паменшылася на 2,2 проц.

На шкляной прамысловасьці бронь за гэтыя 4 месяцы зьнізілася з 14 проц. да 10,9 проц.

Папяровая прамысловасьць Беларусі на 1-е красавіка, без Гомельшчыны, налічвала 4,7 проц. броні, на 1-е жніўня, разам з Гомельшчынай, толькі 3,6 проц.

„Рана птушачка запела“.

Гаспадарчыя органы не спыняюцца на маючымся ўжо зьніжэньні процанту броні падросткаў, якое у некаторай меры таксама зьяўляецца вынікам скажэньня пастаноў партыі аб рацыяналізацыі нашай прамысловасьці.

Гаспадарнікі ідуць яшчэ далей. Шэраг гаспадарчых органаў і ВСНГ Беларусі ўстанаўліваюць свае, ні на чым неабгрунтаваныя нормы броні. Лесбел, Белпапертрэст і іншыя гаспадарчыя організацыі настайваюць на тым, каб уключыць у колдагаворы 1928 году спэцыяльныя пункты аб выключэньні ўстанаўліваемых імі самімі пэўных процантаў броні ў адносінах толькі да кваліфікаванай рабочай сілы, занятай у прамысловасьці.

Але гаспадарнікі пасьпяшыліся. Яны забыліся аб тым, што нормы броні ўстанаўліваюцца на ўсесаюзным маштабе і потым толькі іх можна прыстасаваць да мясцовых умоў. **Ва ўсесаюзным-жа маштабе новыя нормы броні яшчэ не ўстаноўлены.**

А што ВСНГ?

Аднэй з галоўных прычын фактычнага зьніжэньня процантаў броні ў нашай прамысловасьці зьяўляецца налічча вялікай колькасьці перарасткаў у ліку броні. У некаторых галінах прамысловасьці даходзіць да 50 проц. у адносінах да ўсяе броні.

Значная-ж частка гаспадарчых органаў адносіцца да гэтага вельмі пасыўна і ніякіх мер для зьнішчэньня гэтага зьявішча не прымаюць.

Адначасова мы павінны заазначыць, што ВСНГ Беларусі, непасрэдны кіраўнік нашай прамысловасьці, **адмахваючыся агульнымі абежнікамі, тым самым спрыяе далейшаму працягваньню скажэньняў асобных гаспадарнікаў у пытаньнях броні падросткаў.**

Комсамол за інтарэсы рабочай моладзі.

Вядома, што комсамол ніяк не можа згадзіцца з гэтымі захадамі асобных гаспадарнікаў, якія могуць прывесьці да самых кепскіх вынікаў у адносінах працы рабочай моладзі.

ЦК ЛКСМБ рашуча асудзіў гэтыя тэндэнцыі да ўстанаўленьня асобных нормаў броні ў кожнай галіне прамысловасьці.

ЦК ЛКСМБ таксама настойвае на тым, каб да лютага 1928 году была закончана ўся праца па разбраніраваньні перарасткаў, якія лічацца ў колькасьці броні. Аслабаніўшыяся ад іх месцы безадкладна павінны быць запоўнены новымі кадрамі бронь-падросткаў.

М. Зак.

Міжнародны агляд.

Дзень за днём.

Як разбройваецца Амэрыка.

У горадзе Вашынгтоне адчынілася 70-ая сэсія конгрэсу Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі.

На адчыненьні гэтай сэсіі конгрэсу быў агалошан ліст прэзыдэнта Злучаных Штатаў Куліджа, у якім ён падводзіць вынікі асноўных момантаў у політыцы ўраду.

Кулідж падцьвердзіў, што ўрад, як заўсёды, за «ўзмацненьне марской і паветранай абароны».

— «Трэба памятаць—адзначае ў лісьце Кулідж—што на нас ляжыць адказнасьць за ахову шматлікага насельніцтва і вялізарнейшага багацьця, якое выпала на шчасьце нашага народу. Каб здаволіць гэтыя патрабаваньні мы павінны мець значную ўзброеную сілу. Наша вайсковая магутнасьць заўсёды (??! рэд.) служыць інтарэсам агульнага міру. Усюды, дзе зьяўляецца наш штандар—устанаўліваецца парадак і ахова праў чалавецтва»...

Добра прэзыдэнцкая птушка сьпявае, але ўвесь той вайсковы браніраваны кулак, які зараз, з кожным днём, усё больш узмацняецца ў Амэрыцы, відавочна пагражае інтарэсам захаваньня, таго міру, аб якім так соладка застанаўліваўся ў сваім лісьце прэзыдэнт Кулідж.

Аб нашай суседцы Польшчы.

З усіх нашых суседзяў самая блізкая (у адносінах, вядома, межаў)—гэта Польшча.

Зараз мы паглядзім, як наша суседка Польшча рыхтуецца да разброеньня.

Палова дзяржаўных сродкаў у Польшчы ідзе на вайсковыя патрэбы.

У выніку, на кожнага грамадзяніна «незалежнай Польскай рэспублікі» прыпадае 11 руб. падатку выключна на армію. У той-жа час у нас, у Савецкім саюзе, на кожнага грамадзяніна прыпадае чатыры рублі на армію.

Далей.

У мірны час на 25 з паловай мільёнаў насельніцтва Польшчы ўтрымліваецца армія з 325 тысяч салдатаў, гэта значыць на 90 грамадзян Польшчы прыходзіцца адзін салдат.

У СССР-жа адзін чырвонаармеец прыходзіцца на 250 жыхароў.

Організацыя польскай арміі і яе абучэньне пабудаваны на французскі манер.



Польшча ў апошні час зварачвае больш увагі разьвіцьцю тэхнічных войск: браняных часьцей, танкавых батальёнаў і паветранага флёту.

Вучоба і выхаваньне польскага салдата трымаецца **на муштры**, дысцыпліна—на бізуне. Польскі салдат ня мае грамадзянскіх правоў. Польскага салдата выхоўваюць у рэлігійным напрамку. Для гэтага ў польскай арміі існуюць спэцыяльныя організацыі. У штабах акруг маюцца аддзяленьні «духоўнай консісторыі» (папоўскі адміністрацыйны апарат), у палкох—ксяндзы.

Улічваючы ўсе асаблівасьці польскай арміі, неабходна адзначыць, што існуючая толькі дзесяць год польская армія зрабіла значныя посьпехі. У выпадку вайны з намі Польшча зьявіцца сур'эзным ворагам.

Гэта трэба нам заўсёды мець на ўвазе. Нам трэба яшчэ, яшчэ і яшчэ больш умацніць вайсковую вучобу, зрабіць усё магчымае для большай абароназдольнасьці нашай краіны.

Клясавыя бойкі ў Нямеччыне.

У адным з папярэдніх аглядаў у «Чырвонай Зьмене» мы ўжо застанаўліваліся на тых шматлікіх забастоўках, якія зараз маюць месца ў Нямеччыне.

Завастрэньне клясавай барацьбы ў Нямеччыне—гэта бязумоўны факт.

1927 год зьявіўся ў гэтых адносінах пераломным. На працягу гэтага году ў Нямеччыне мелі месца забастоўкі, ахапіўшыя самыя розныя галіны прамысловасьці.

Толькі за апошнія месяцы мелі месца буйныя забастоўкі чыгуначнікаў, рабочых цыгарачнай прамысловасьці, гарнякоў, тэкстыльшчыкаў. У рэшце праз два—тры тыдні Нямеччына зьявіцца месцам надзвычайнага клясавага конфлікту.

Уладары мэталюргічнай прамысловасьці ў паўночна-заходняй Нямеччыне рыхтуюцца абвясьціць лёкаут каля 300.000 рабочым.

Справа ня толькі ў экономічных супярэчнасьцях, а ў тым, што капіталісты рыхтуюць рашучы бой, каб зламаць узрастаючую сілу пролетарыяту Нямеччыны.

Побач з гэтым капіталісты не жадаюць адмовіцца і ад сваіх звыш-прыбыткаў.

Якія-ж гэтыя звыш-прыбыткі?

Вядома, што ўздым народнай гаспадаркі за апошнія адзін-два гады апіраўся на наступныя падставы:

1) зьніжэньне заробку, 2) павялічаньне працоўнага дню (адмена 8-гадзіннага працоўнага дню), 3) тэхнічныя паляпшэньні, 4) прыток замежных сродкаў, якія за апошнія два гады дасягнулі лічбы у $5\frac{1}{2}$ мільярдаў марак.

Урэшце прамысловасьць Нямеччыны дасягнула вялізарных посьпехаў.

Так, напрыклад, буйнейшы сталёвы траст «Аб'яднаныя сталёвыя прадпрыемствы» павялічыў вытворчасьць жалезасырцу на 65 процантаў, сталі—на 64 проценты і г. д.

У той-жа час колькасьць рабочых не павялічылася ні на адзін процант.

Калі за гэты час ўзровень заробку рабочых некалькі павялічыўся, дык гэта павялічэньне цалкам было скасавана павялічэньнем цэн на продукты і таму няма нічога незвычайнага ў тым, што нямецкі рабочы ўзмацняе весьці барацьбу да пераможнага канца.

Надыходзяць упартыя клясавыя бойкі.

Роля соцыял-дэмократаў у гэтай барацьбе не выклікае ніякіх сумненьняў.

Здраднікі здраднікамі і застануцца.

Але факты за апошні час кажуць за тое, што пролетарыят Нямеччыны, калі яшчэ і ня ідзе супроць сваіх соцыял-дэмократычных правадыроў, дык ужо пачынае абыходзіць іх і самастойна пачынае весьці барацьбу за свае інтарэсы.

Кантон у руках рэволюцыйнага войска.

Усе чужаземныя газэты, падкрэсьліваюць, што выступленьні комуністых у Кантоне і ў Чанша і нябывалая актыўнасьць рабочага руху ў Шанхаі зьяўляюцца вынікам добрапрадуманага пляну. Газэты патрабуюць адзаўленьня барыкад, дротавых загародак і забароны выходзіць на вуліцу ўвечары. Муніцыпальная рада агаласіла паведамленьне, у якім выказвае ўпэўненасьць, што «ўсе лёяльныя грамадзяне падтрымаюць дзейнасьць рады ў бягучы трывожны час».

Паводле паведамленьня з Ганконгу, флёт, які знаходзіцца ў Кантоне, застаўся верным Чан-Фа-гуэю і пачаў бамбардыраваць горад. Востраў Хайнан (супроць Кантону) заняты Лі-Фу-лінам. Сюды-ж уцяклі Чан Фа-гуэй і іншыя члены ўраду.

Паводле слоў японскага агэнцтва, войска Лі-Фу-ліна перайшло рэчку і ўзяло назад паўднёвую частку Кантону; паўночная частка застаецца ў руках рэволюцыйнага войска.

Перадаюць таксама, што войска Хуан Ці-сяна наступае на Кантон з поўначы і з заходу. У часе боек у Кантоне выбухнулі пажары. Згарэў японскі шпіталь, японскім маракам удалося выратаваць пэрсонал і хворых. З прычыны пажараў бяздзейнічае электрычнае станцыя.

Перад паўстаньнем саюз маракоў абвясьціў усеагульную стачку. Чыгуначныя і параходныя зносіны спыніліся.

На прыстанях сканілася шмат уцекачоў. Ангельскія маракі адправілі кітайскі параход з уцекачамі ў Ганконг.

Рабочыя друкарні абвясьцілі забастоўку. Газэты ня выходзяць, чужаземны квартал Кантону абвешчан на ваенным становішчы і ахоўваецца японскімі і ангельскімі маракамі.

Паводле паведамленьня японскага агэнцтва, у Чанша комуністы зрабілі спробу організаваць паўстаньне. Шматлікі натоўп напаў на станцыю чыгункі, аднак войска адбіла напад. Паводле другога паведамленьня агэнцтва, 11 сьнежня натоўп разабраў рэйкі чыгункі Чоаян-Учан. Поезд, які ішоў з Чанша ў Іочжоу напярэдні крушэньне. На электрычнай станцыі разбураны сілавыя ўстаноўкі. У розных мясцох гораду выбухнулі хваляваньні. Комуністы кідалі бомбы. На поліцэйскія ўчасткі быў зроблен напад. Жыхарства ў перапудзе. Вайсковая ўлада, паводле слоў агэнцтва, прыдушыла паўстаньне.

Саюзныя навіны.

Акруговая конфэрэнцыя ЛКСМБ. 21-га студзеня 1928 г. скліхаецца Менская Акруговая конфэрэнцыя ЛКСМБ.

Парадак дню: 1) вынікі 15-га Ўсесаюзнага партзьезду; 2) даклад ЦК ЛКСМБ; 3) справаздача АК і рэвкамісіі; 4) аб піонэрпрацы і 5) выбары.

Модус прадстаўніцтва на конфэрэнцыю наступны: 1 дэлегат на 100 чалавек.

Чарговы Плэнум Менакругкому ЛКСМБ скліхаецца ў першых лічбах студзеня 1928 г.

Плэнум абмяркуе пытаньні падрыхтоўкі да акруговай конфэрэнцыі, становішча работы з актывам і далейшыя задачы ў гэтай галіне, вынікі выкананьня дырактыў аб працы комсамолу сярод бядняцтва і батрацтва.

Комсамольцы ў партыю. За апошні час па Менскай організацыі шырока разгарнулася кампанія па перадачы ў партыю лепшых комсамольцаў.

У Заслаўскім раёне рэкомэндавана ячэйкамі ў партыю 50 комсамольцаў, Кастрычніцкім—42 і Гарадзкім—71. Праз райкомы ўжо прапушчана 90 проц. комсамольцаў, падаўшых заявы.

Сэмінары піонэрпрацаўнікоў. Менакрбюро ЮП вызначыла організаваць у бліжэйшы час некалькі сэмінарыяў правадыроў гарадзкіх піонэрскіх атрадаў.

Сэмінары будуць праводзіцца з правадырамі беларускіх атрадаў—па беларускай мове і яўрэйскіх—па яўрэйскай.

Акруговая нарада па фізкультуры. Менакругком ЛКСМБ сумесна з АСФК скліхаюць 25-га сьнежня г. г. акруговую нараду раённых працаўнікоў фізкультуры.

Нарада павінна абмеркаваць становішча і далейшыя задачы фізкультурнай працы на вёсцы, заслухаць даклады з месц і вызначыць удзел вясковых фізкультурнікаў у акруговым зімовым сьвяце фізкультуры.

На Асінастроі.

Што будзе зроблена ў будучым годзе.

ВСНГ СССР зацьвердзіў плян працы на Асінастроі ў 1928 годзе.

Згодна пляну, за гэты год павінна быць закончана пабудова чыгуначнай лініі ад Выдрыцы да Арахава, галоўнага корпусу будучай электрастанцыі, лазьні, сталоўкі для рабочых і іншых падобных будынкаў.

Устаноўлен лёкомобіль.

Зараз у мястэчку Выдрыцы абсталёўваецца памяшканьне для часовай электрастанцыі, якая будзе даваць энэргію для ўсіх прац на Асінастроі.

Для часовай электрастанцыі зроблен цэлы шэраг заказаў, пераважна на заводах СССР. Ужо атрыманы і ўстаноўлен лёкомобіль у 120 конскіх сіл.

Торфакапальныя машыны.

Управа Асінастрою ўстанаўлівае на Асінаўскім балоце 6 торфакапальных машын, пры дапамозе якіх у будучым годзе будзе адабыта каля 2 мільёнаў пудоў торфу.

Да скančэньня пабудовы станцыі—гэта значыць да 1929 году—павінен быць зроблен запас торфу ў 5 мільёнаў пудоў.

На роднай мове.

У Менску існуе 37 сямігадовых школ, якія праводзяць навучаньне з дзецьмі на іх роднай мове.

З агульнага ліку 37-мі маецца 19 школ беларускіх, 12—яўрэйскіх, 3—польскіх і 3—расійскіх.

Юбілей Чырвонай Міліцыі.

Ёю пройдзен шлях гэроічнай барацьбы.

Рабоча-Сялянскай Чырвонай Міліцыі Беларусі мінула 10 год.

У агні грамадзянскай вайны нарадзілася наша міліцыя і за 10 год свайго існаваньня прайшла слаўны рэволюцыйны шлях.

Міліцыяй была праведзена пасьпяховая праца **па барацьбе з бандыцкімі шайкамі**, якія парушалі мірнае жыцьцё працоўных нашай краіны.

Гэроічная праца міліцыі настолькі паралізавала бандыцкія шайкі, што зараз ад бандытызму амаль не засталося і сьледу. Аб гэтым яскравей усяго кажуць лічбы: калі ў 1921 годзе на тэрыторыі Беларусі была праблена 1009 бандыцкіх налётаў, дык у гэтым годзе іх было ўжо толькі—6.

Таксама пасьпяхова змагалася міліцыя і крымінальны вышук з іншага роду злачынствамі. Гэтая барацьба вырвала з шэрагу міліцыі не аднаго чалавека.

За 10 год сваёй працы міліцыя і крымвышук налічваюць 140 таварышоў загінуўшых на фронце барацьбы са злачынным элемэнтам.

Слаўная памяць гэтым таварышом, загінуўшым ў схватцы з ворагамі саветаў.

У другое дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня Рабоча-Сялянская Чырвоная Міліцыя ўступае бадзёрым рэволюцыйным крокам, памятуючы слаўных традыцыі сваёй баявой гісторыі.

У Менску будзе зоолёгічны парк.

Прэзыдыум Інбелкульту ўхваліў організаваць у Менску пры нядаўна створаным музэі жывёлаводства вялікі зоолёгічны парк.

У гэтым парку будуць знаходзіцца прадстаўнікі ўсіх жывёлін, якія маюцца ў БССР. Дзеля набыцьця гэтых жывёл Інбелкульт пасылае ў акругі пэўныя экспэдыцыі.

Зімовыя вакацыі ў школах

Наркамасьветы ўстанавіў новыя тэрміны для зімовых вакацый у навучальных установах БССР.

Ва ўсіх гарадзкіх і местачковых сямігодках, профшколах, школах ФЗВ, школах рабочай моладзі і павышанага тыпу і на агульна-адукацыйных курсах зімовыя вакацыі адбудуцца паміж 1 і 15 студзеня.

У вясковых школах тэрмін вакацый устаноўлен з 7 па 16 студзеня, а школах сялянскай моладзі—з 1 па 8 студзеня.

Новая гаспадарчая часопісь.

Беларускі Інстытут Сельскай і Лясной Гаспадаркі прыступіў да выданьня новай навуковай часопісі пад назвай «Сельская і Лясная Гаспадарка».

Часопісь будзе выходзіць раз у паўтара-месяцы. Яна мае на мэце вывучэньне сельска-гаспадарчай экономікі, прыбытковасьці сельскай і лясной гаспадаркі ў БССР, шляхоў да яе палепшэньня і г. д.

У ТРЫ РАДКІ.

— **У будучым годзе на ахову здароўя ў БССР** будзе патрачана звыш 7 мільёнаў рублёў.

— Галоўпалітасьветы працягнуў тэрмін другой усебеларускай мастацкай выстаўкі да 1-га сьнежня 1928 году.

— Да гэтага часу па Беларусі паступіла сельска-гаспадарчага падатку на 4 з паловай мільёны рублёў.

— З наступнага навучальнага году праўленьне БДУ організуе „Пэдфак на даму“ для асоб, якія жадаюць атрымаць вышэйшую асьвету наміма ВНУ.

— У хуткім часе Белдзяржмузтэхнікум наладжвае па рабочых клюбах Менску концэрты сіламі студэнтаў.

— **У Віцебску адчыніўся новы вячэрні Універсытэт для рабочых.**

— 28-га студзеня скліхаецца Ўсебеларускі зьезд **МОПР'у.**

СУД.

„Абаронец“.

Захацелася «выйсьці ў людзі» і стаць «начальствам» селяніну Заслаўскага раёну Васілю Захарэвічу. А як-жа дабіцца гэтага пры Савецкай уладзе; калі не адстойваць (хаця-б на словах) пры кожным зручным і няэручным выпадку інтарэсы вясковай беднаты.

Такая тактыка далася Захарэвічу без асаблівых цяжкасьцяй. На кожным сходзе выступаў ён у абарону бяднейшага насельніцтва, чым паступова набываў сабе патрэбны аўтарытэт.

Вось чаму, калі вёсцы трэба было вылучыць на адказную работу ў акрузе аднаго з сваіх сялян, кандыдатура Захарэвіча ўстала сама сабой і прайшла амаль аднагалосна.

— Бывай, Васіль,— казалі сяляне праважаючы Захарэвіча ў Менск.—Заўсёды памятай аб нашых інтарэсах, не давай у крыўду вясковую беднату.

Аднак, прыехаўшы ў Менск на пасаду загадчыка землеўпарадкавальнай часткай АКРЗА, наш вылучэнец зусім зьмяніўся і паказаў свой сапраўдны твар.

Прыступіўшы да выкананьня службовых абавязкаў, Захарэвіч кіраваўся лёзунгам: «Сваа кашуля бліжэй». Перш чым разьбіраць шматлікія сялянскія заявы аб правядзеньні землеўпарадкаваньня ды інш., Захарэвіч парашыў задаволіць сваю ўласную сям'ю і сваякоў.

Вядомы вясковы багацей Лычкоўскі, які мае 18 дзесяцін зямлі, але прыходзіцца цесьцем нашаму новаму «начальству» надзяляецца яшчэ двума дзесяцінамі зямлі, адцятымі ў бедняка.

Жонка Васіля—Лізавета Захарэвіч, якая піша да свайго мужа заяву аб надзеле яе 6 дзесяцінамі зямлі і сенажацьцю, атрымоўвае ўсё патрабуемае.

Скаргі сялян, якім так не пашанцавала са сваім «вылучэнцам», прымусілі Менакрза зьняць Захарэвіча з пасады і прыцягнуць яго да судовай адказнасьці.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Васіля Захарэвіча за выкарыстаньне службовага становішча ў асабістых інтарэсах да аднаго году зьняволеньня з суровым абмежаваньнем.

Я. З.

„Вялікі нямы ці вялікі глухі?“

Грандыёзны дыспут аб кіно.

Запрашаецца ўся працоўная моладзь.

У панядзелак 19 сьнежня, а 8-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні кіно „КУЛЬТУРА“ рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ сумесна з фото-кіно-сэкцыяй профсаюзу Працмастацтва і клюбам „КІМ“ організуе ДЫСПУТ МОЛАДЗІ АБ КІНО-ФІЛЬМАХ.

Уступнае слова тав. Вольскага.

Да ўдзелу ў дыспуце запрашаюцца т. т. Кнорын, Баліцкі, Ігнатоўскі, Сянкевіч, Ваноўскі, Абрамчук, Бараньнікаў, Галавач, Ратнэр, Гершон, Гольбрайх, Табайнік, Кавалінскі, Шукевіч-Траццякоў, Ашаровіч, Красоўскі, Казанаў, Жылуновіч, Чарот, Пічэта (проф.), Вольфсон (проф.), Замоцін (проф.), Шчакаціхін (проф.), Піотуховіч (проф.), Купала, Колас, Бядуля, Александровіч, Гарэцкі, Глыбоцкі, Зарэцкі, Галкін, Кацнэльсон, Валасевіч, Кухаровіч, Ашаровіч, Гарадокер, Аршанскі, Асьмоў, Шульман, Міхайлаў, Хруцкі, Дыла, [illegible], Шымшалевіч (клюб друкароў), Бух, Вайнэр, Давідовіч, Айзенштадт (саюз харчавікоў), Розэнталь (булачная ЦРК), Паляков (аб'яднаная профтэхшкола), Васілеўскі (МББ ч.), Яцкоўскі (завод „Дрэваапрацоўшчык“), Рубін (другая друкарня), Патрэвіч (гута „Пролетары“), Карнееў (кастрычнікаўскі райком ЛКСМБ), а таксама ўсе жадаючыя.

Білеты на дыспут па заяўках ячэек ЛКСМБ, юнсэкцый клюбаў, заўкомаў і мясцкомаў будуць выдавацца у рэдакцыі „Чырвоная Зьмена“ і клюбе „КІМ“.

Экран і сцэна

„Падкідыш“.

Беларускі вандроўны тэатр Галубка.

Тэатр Галубка—вясковы тэатр. Амаль усе пастаноўкі яго разьлічаны на сялянскага гледача. Такой п'есай зьяўляецца і „Падкідыш“—п'еса самога Галубка.

П'еса далёка ад сучаснасьці. Гэта—малюнак на бытавую тэму з дарэволюцыйнага часу.

Гісторыя незаконнароджанага—„байструка“, яго жыцьцёвая барацьба, шуканьне маці—вось аб чым апавядае п'еса. Яна сьмяецца над адвечным мяшчанскім страхам, над абывацельскімі думкамі аб „незаконнароджаным“ дзіцяці, паказвае ўсе сумныя вынікі такога погляду.

Мяшчанскай сям'і процістаўляецца рабочая сям'я, якая прытуліла падкідыша, дала яму ўсё тое, што было магчыма.

Для вёскі такі сюжэт, бязумоўна, каштоўны. Калі ў нас яшчэ існуюць забабоны ў адносінах да так-званых „байструкоў“, дык больш усяго ў вясковай глушы. І, бязумоўна, надзвычайна добра тое, што такая п'еса ёсьць у рэпэртуары вясковага тэатру.

Напісаны „Падкідыш“ зразумелай мовай. Сцэнкі нескладаныя, не прэтэндуюць на вялікую арыгінальнасьць—яны простыя і зразумелыя.

Адзначым, як недахоп—расцягнутасьць. Напрыклад, упаўне можна было зьліць 4-ю і 5-ю дзеі (сустрэчы маткі з падкідышам). У гэтых дзеях шмат зусім непатрэбных момантаў (сцэнка ў рэстаране з гарманістам і інш.), якія можна выкінуць і зрабіць больш сакавітую дзею.

Пастаноўка—самая простая, у рэалістычных тонах, якраз так, як патрэбна для вясковага тэатру.

Не вышэй—гульня. Не гледзячы на тое, што ў трупе Галубка бадай усе аматары,—гульня ўсіх удзельнікаў утварае вялікае ўражаньне.

Тэатр быў і будзе заўсёды жаданым госьцем на вёсцы. І сярод рэпэртуару гэтага тэатру „Падкідыш“ у перапрацаваным выглядзе зойме сне апошняе месца.

Нін. А.

„Маска сарвана“.

(Кіно «Культура»)

Цяжка сказаць, што жадалі даць гэтым кіно-фільмам яго пастаноўшчыкі. „Маска сарвана“ апавядае аб сучаснай Польшчы. Відаць фільмам жадалі асьвятліць дзьве рэчы: 1) сыстэму падлогаў і шпіонажу польскага ўраду і 2) патрыётызм польскай арыстакратыі (у сувязку з гэтым антысэмітызм і інш.). Аднак ні тое, ні другое поўнасьцю не высьветлена.

Пан Звалінскі забываў у замежнай камандзіроўцы. Зьвярнуўшыся на бацькаўшчыну у Польшчу, ён даведваецца, што дзякуючы розным інтрыгам, яго звольнілі ад працы ў генштабе. Звалінскі ўвесь поўны „ліберальных“ поглядаў—кажа лгрэйку, утварае скандал у польскай патрыётычнай ложы «Польшча для палякоў»...

Адкуль гэтага ўсяго панабраўся польскі афіцэр так і застаецца невядомым. Што на яго зрабіла ўплыў у замежнай камандзіроўцы не паказваецца. Таму гэты тып атрымаўся далёка непераканаўчым.

А хто такі Чэкорскі? Ён увесь час займаецца падлогамі супроць Звалінскага, учыняе суд над апошнім—справа яго рук. Што ім кіруе? На гэта фільм бадай не дае адказу. Можа толькі тое, што Звалінскі перашкаджае шчасьцю яго каханьня?...

Няма ў фільму пісоднага намёку на існаваньне рабочай класы ў Польшчы, на тое, што побач знаходзіцца Савецкі Саюз.

Паказваецца польская арыстакратыя, а твар яе не высьветлен. Цені Бельведару (рэзыдэнцыя Пілсудзкага так і не паказан.

Ёсьць у фільму адзін канфузны момант—майстру падложных лістоў паказваюць пісьмо Звалінскага і тэкст пісульвкі, якую павінен ён напісаць. Майстар бадай не гледзячы, адразу і хутка піша. Так было і з пастаноўшчыкамі—ім прынеслі тэму, пастаноўшчыкі не вывучылі добра яе і ў выніку малюнак сучаснай Польшчы атрымаўся вельмі дробным.

Міх Т.

Сам сабе тэхнік.

Ручныя пажарныя бочкі.

Той хто калі-небудзь бачыў пажар на вёсцы, ведае галоўнае сялянскае гора: мы не можам хутка заглушыць пачатак пажару і—гэта гора усяго—ніяк не ўхітрымся організаваць дастаткова добрую і хуткую пазачу вады да палаючай хаты. То дзяжурная пажарная падвода несправўная, то ў бочцы няма вады, то коні не на месцы... Адным словам, адно з гэтых трох няшчасьцяў заўсёды бывае пры вясковым пажары. Таму, звычайна, каля загарэўшайся хаты—шум і сумятоха. Некалькі чалавек бегаюць з вёдрамі, піхаюцца і на палову праліваюць ваду па дарозе, а ў выніку выгарае куды больш таго, што загінула-б пры больш нормальнай пастаноўцы справы.

З гэтай прычыны мы прапануем наступнае. Побач з самым сур'ёзным і строгім назіраньнем за чысьцінёю і прыгоднасьцю дзяжурнай пажарнай падводы трэба пабудаваць яшчэ некалькі рухавых ручных пажарных бочак.

Пабудаваць іх зусім не цяжка. Звычайная бочка ставіцца на два невялічкія колы, а да яе прымацоўваецца доўгі кій з папярочнай перакладзінай на канцы, досыць вялікай, каб за яе маглі ўхапіцца двое мужчын. На кручок да бочкі вешаецца вядро.

Калі такога роду простыя бочкі, напоўненыя вадою, будуць у вёсцы праз кожныя дзьве хаты, дык іх можна будзе ўраз падаць да загарэўшайся хаты і ва ўсялякім выпадку забясьпечыць тушэньне вадою, пакуль пажарная падвода не зьбярэцца з сіламі і не падвязе да месца пажару дастатковую колькасьць вады.

Рухавая пажарная бочка.

Можна быць упэўненым, што грошы патрачаныя на гэтыя бочкі, зэкономяць многія дзесяткі рублёў.

Хуткая пабудова паркану.

Нават пабудова самога простага драўлянага паркану нам не заўсёды ўдаецца, як сьлед.

Сапраўды, як мы звычайна забіваем асноўныя слупы для паркану? Адзіны чалавеку пры нашым саматужным спосабе гэтага зрабіць амаль немагчыма. Таму часьцей за ўсё такую аперацыю робяць удвух і значыць удвух трапляць час на такі сусьцяковы занятак.

Калі памочніка няма пры пабудове, дык справа абстаіць яшчэ горш: прыходзіцца спачатку выкапаць яму. Потым устаўляць туды слуп і асьцярожна забіваць яго, увесь час правяраючы—ці правільна ён ідзе ў з маю.

Ёсьць надта просты і няхітры спосаб убіваць слуп аднаму без асаблівых цяжкасьцяў і амаль ідэальна правільны.

Вазьмеце металёвую пласьцінку шырынёй ў 1-2 калі. Калі спэцыяльнай пласьцінкі ў вас няма,—дык можаце скарыстаць для гэтага просты стары абруч ад бочкі. Загнеце гэтую пласьцінку так, як паказана на нашым малюнку, зрабіўшы на ёй выгібы. Зрабеце дзіркі ў пласьцінцы ў месцах выгібу і пры дапамозе шпількоў устаўце ў іх тры драўляныя ножкі. Выгінаючы пласьцінку, майце на ўвазе, каб яе ўнутраны дыяметр быў-бы крыху больш таўшчыні самага тоўстага з слупоў, з якім вы будзеце мець справу. Даўжыню драўляных ножак вазьмеце роўную паловe 3½ аршыну.

Даставаць вызначыўшы на зямлі месца ўстаноўкі слупа, вы ставіце тут ваш металёвы хамут, устаўляеце ў яго завостраны слуп і спакойна забіваеце яго ў зямлю; хамут увесь час трымае яго ў правільным напрамку.

Галоўлітбел № 24867.

Экономнае кармленьне сьвіней.

Мы не ўсім добра наладжваем хаця-б такую няхітрую справу, як кармленьне нашай хатняй жывёлы. Дзеля пачатку возьмем сьвіней і парасят.

Звычайна ў вёсцы адбываецца гэта так. Нальюць у карыта ядў і даюць магчымасьць парасятам барахтацца там, як ім хочуць. Парасятам цесна, яны брыдкія, нязграбныя. І таму звычайна іх абед пачынаецца з таго, што яны, калі не выцьлюць усяго на зямлю, дык ва ўсякім выпадку трохі частку корму абавязкова расьплёшчуць вакол сабе. У выніку парасяты атрымоўваюць куды меней таго, чым [illegible] даюць.

Разумней было-б пабудаваць вельмі няхітрае прыстасаваньне, якое-б дало магчымасьць парасятам зусім спакойна зьесьці ўсю сваю порцыю.

Дзеля гэтага трэба зрабіць адно круглае [illegible] карыта (вышыня—5 вяршкоў, дыяметр—каля 1—1 з пал. аршыны) і [illegible] без дна [illegible] вышынёю ў 1—1 з пал. аршыны і дыяметрам ў 4-5 вяршкоў. Пры дапамозе дроту трэба замацаваць гэты цылідр над карытам так, каб ніжні край яго быў, прыкладна, на ўзроўні верхняга краю карыта. Вольнае месца паміж [illegible] цыліндру і краямі карыта трэба падзяліць наземна дротам на некалькі частак з такім разьлікам, каб у кожнае такое [illegible] магла свабодна ўвайсьці парасячая галава.

Карыстацца такім карытам не цяжка. Корм трэба ў карытку налівань зьверху ў верхні цыліндр, а парасяты дастаюць яго з ніжняга карыта, куды ён зараз-жа пападае. Гэтым мы дасягаем таго, што: 1) парасяты не піхаюцца, маючы свае асобныя месцы. Дзякуючы гэтаму, уся працэдура кармленьня адбываецца зусім спакойна і сам корм не раскідаецца; 2) мы можам падбаўляць парасятам корму нават і ў той час, калі яны ядуць, не адганяючы і не абліваючы іх, што звычайна адбываецца пры цяперашнім спосабе.

Пабудаваць-жа такое прыстасаваньне вельмі проста і лёгка.

Гутаркі урача.

Чым карысна фізкультура ўзімку.

Спортам і гуль[illegible] хутчэй функцыяніраваць [illegible] жаем увесь наш організм [illegible] непатрэбныя нам, акрамя [illegible] організму і прыносіць да [illegible] сьвежыя харчы. Асабліва [illegible] практыкаваньні для лёгкіх [illegible] таго, што адпрацованая цёмная кроў [illegible] на лёгкіх, асьвяжаецца [illegible] і адплывае ўжо чырвоная і ачышчаная.

Пры фізічных практыкаваньнях дыханьне робіцца глыбокім, лёгкія захапляюць больш паветра і лепш ачышчаюць кроў.

Узімку ўсе стараюцца зьберагчы цяпло, дзеля чаго шчыльна зачыняюць дзьверы, вокны і форткі. Дзякуючы гэтаму, паветра ў памяшканьнях значна псуецца. З другога боку—узімку чалавек менш бывае на вуліцы, менш рухаецца на сьвежым паветры, а гэта таксама значна адбіваецца на здароўі. Улічваючы ўсё гэта, мы можам сказаць, што фізічныя практыкаваньні на сьвежым паветры абсолютна неабходны.

Зімовыя фізічныя практыкаваньні могуць быць самыя разнастайныя.

Калі вы пасьля працы, як кажуць, размяцецеся на сьвежым паветры, дык і гэта добра, таму, што пры гэтым праветраваюцца лёгкія і організм адразу асьвяжаецца.

Але асабліва важна організоўваць зімовыя спортыўныя забавы. Галоўнейшыя з іх—лыжы, санкі і канькі.

Катаньне з гары, напрыклад, акрамя таго, што асьвяжае організм, прывучае яшчэ да хуткасьці і дасканаласьці руху, да сьмеласьці і знаходлівасьці.

Піонэрскія фарпосты ў школах могуць быць ініцыятарамі ў організацыі масавых катаньняў.

Спорт мае яшчэ адно спэцыяльнае значэньне—гэта трэніроўка. Калі спортсмэн, напрыклад, трэніруе сабе ў скачках, гэта азначае, што ён прывучае свае ногі рабіць трапныя і накіраваныя, простыя да мэты рухі.

Выхаваць у сабе такія якасьці асабліва важна вязграбным людзям.

Матвес.

Ліст у рэдакцыю.

Тав. рэдактар!

Просім зьмясьціць у вашай [illegible] наступнае:

[illegible] у „Чырвонай Зьмене“ № [illegible] [illegible] Дадзен, што [illegible] робочая моладзь [illegible] у незаконным часе [illegible] пакажт пастаноўкі „Каля Тарамы“ [illegible] і [illegible] там сваю ацэнку гэтай пастаноўкі.

Рабочая моладзь МББ [illegible]
Гарачка, Ганчаронак, Грушоўскі,
Дашчатаў, Доўнар, Лобач [illegible]
бач Г., Мароз, Пусель і [illegible]
ская А.

Адказы чытачам.

Хламаву (№ 1266). Сваёй кіно-студыі Белдзяржкіно ў гэтым годзе не адчыніць.

Аліну В. (№ 1267). У Менску зараз [illegible] беспрацоўе, і таму вясковаму [illegible] знайсьці працу будзе цяжка.

[illegible] (№ 1268). Рабочым [illegible] толькі тры месяцы, а таму [illegible] поўнасьцю кандыдацкі стаж. Ты больш, [illegible] кандыдатам ты быў прыняты, калі [illegible].

Васільеву (№ 1270). Дзеля таго, каб твой брат меў магчымасьць прыехаць з Польшчы ў СССР, табе трэба зьвярнуцца ў Народны Камісарыят Чужаземных Спраў. Там існуе спэцыяльны аддзел, які займаецца гэтай справаю.

В. В. (№ 1271). Менская радыё-станцыя працуе ўжо праз новы перадатчык—магнітафон. Перадачы чутны значна лепей.

Яму-ж (№ 1272). На дэтэктарны прыёмнік тыпу „Пролетары“ Маскву пачуць у Бабруйску нельга.

Раваўшчыку № 1273. Выбары на раённыя конфэрэнцыі ў ячэйках пачынаюцца 1-га сьнежня.

Згублены.

Комсамольскі білет за № 1298, на імя ЦОФІНА І. С., выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет на імя Абрамовіча І., выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

— Часовае пасьведчаньне за № 37 на імя Карачуна, выдадзенае Менакругкомам ЛКСМБ.

Адказныя рэдактары: (А. Бараньнікаў (А. Курцін

1-ая дзяржаўная друкарня.